УДК 947.6

В.Я. Бездзель

# Вобраз Вялікай Айчыннай вайны ў свядомасці дзяцей

Вялікія гістарычныя падзеі, якія закранаюць ці змяняюць ходу развіцця краін, знаходзяць сваё адлюстраванне ў свядомасці кожнага чалавека. Вялікая Айчынная вайна не з'яўляецца выключэннем. Доўгі час грамадству навязваўся вобраз вайны, які задавальняў партыйнае кіраўніцтва, а менавіта аб кіруючай і выключнай ролі партыі ў перамозе над фашызмам. Савецкая гістарыяграфія вымярала ўдзел дзяцей у вайне толькі іх антыфашысцкай барацьбой. Пад уплывам агульнасусветнай тэндэнцыі да антрапалагізацыі гістарычнай навукі ў краінах постсавецкай прасторы звярнуліся да гісторыка-псіхалагічных аспектаў падзей 1941–1945 гг. Асэнсаванне гэтага боку гісторыі вайны, яго актуальнасць спрыялі выдзяленню новай междысцыплінарнай галіны ведаў – ваенна-гістарычнай антрапалогіі. Аб'ектам яе вывучэння з'яўляюцца чалавек і грамадства ў экстрэмальных умовах узброеных канфліктаў [1]. Адной з задач канкрэтна-гістарычных даследаванняў у рамках адзначанага вышэй накірунку будзе аналіз комплексу ўяўленняў пра вайну ў свядомасці яе ўдзельнікаў, г.зн. аналіз вобраза вайны. У дадзеным артыкуле мы разгледзім, як фарміраваўся і змяняўся вобраз вайны ў дзіцячай свядомасці пад уплывам розных фактараў. Разам з тым, намі не закранаецца вобраз вайны вачыма дзяцей калабарацыяністаў і ўдзельнікаў Саюза беларускай моладзі, паколькі практычна адсутнічаюць успаміны гэтай катэгорыі дзяцей.

База крыніц для вывучэння гісторыка-псіхалагічных пытанняў вайны мае свае асаблівасці. Аснову складаюць успаміны ўдзельнікаў разглядаемых падзей (у нашым выпадку дзяцей), якія адрозніваюцца эмацыянальнасцю, вобразнасцю і непасрэднасцю, у чым і заключаецца іх каштоўнасць як гістарычных крыніц. Важнае значэнне мае і суб'ектывізм выкарыстаных намі ўспамінаў, паколькі вывучэнне ўнутранага свету дзяцей (вобраз вайны і ёсць адна з праяў унутранага свету і суб'ектыўнай рэальнасці дзіцяці) адбываецца пераважна на аснове суб'ектыўных крыніц. Пры гэтым яны даюць магчымасць прасачыць тыповыя погляды і настроі дадзенай сацыяльнай групы. Разам з тым, успрыняцце вайны не можа быць аднародным па прычыне псіхалагічных асаблівасцяў дзяцей, што залежаць ад узросту. На наш погляд, можна выдзеліць тры наступныя групы:

1) дзеці ад нараджэння да 3–4 гадоў. Гэта тыя, хто памятае вайну па ўспамінах дарослых ці старэйшых братоў, сясцёр, сяброў. Іх уласныя ўспаміны – гэта шэраг нязвязных паміж сабой малюнкаў;

2) дзеці ад 3–4 да 6–7 гадоў. Успаміны характарызуюцца эпізадычнасцю. Запаміналіся найбольш яскравыя, эмацыянальныя моманты з жыцця. Гэтая група дзяцей не можа патлумачыць ці назваць прычыну падзей, узнавіць паслядоўны іх ход;

3) дзеці ад 7–8 да 16 гадоў. Здольныя патлумачыць тое, што з імі адбылося, параўнаць, выказаць уласныя меркаванні. Пераважае інтэлектуальны кампанент (спробы рацыянальна, лагічна асэнсаваць з'яву).

«Вобраз вайны» ў шырокім сэнсе слова, як лічыць прафесар А.С. Сяняўская, ніколі не бывае статычным. Яго можна падзяліць на тры тыпы: 1) прагнастыч-

ны (фарміруецца ў дзяцей пад уплывам афіцыйнай ідэалогіі савецкага грамадства, успрыняцця першых дзён вайны (адносіны да нападу Германіі, вера ў неперадажнасць Чырвонай Арміі і г.д.); 2) сінхранічны (складваецца непасрэдна ў ходзе падзей, па меры набыцця рэальнага вопыту; уключае вобраз ворага (яго мова, твар і г.д.), пачуццёвае ўспрыняцце вайны, асацыяцыі); 3) рэтраспектыўны (той, які фарміруецца пасля заканчэння разглядаемых падзей) [2].

Прагнастычны вобраз фарміравала кіраўніцтва краіны, прапаганда да пачатку вайны і ў першыя дні, калі моц Германіі не ўспрымалася сур'ёзна. Дзеці як частка савецкага грамадства знаходзіліся пад уздзеяннем афіцыйнай ідэалогіі, якая ў значнай ступені рыхтавала грамадства да магчымай вайны, што павінна была адбыцца раней ці пазней. Дзяржаўная дактрына пра варожае капіталістычнае атачэнне, у якую так шчыра верыў народ, несла ў сабе інфармацыю, хаця і «схаваную», пра непазбежнасць вайны. Недаацэнка суперніка вылілася ў лозунг «Малой крывёю на чужой тэрыторыі».

Гэтая акалічнасць знайшла сваё асэнсаванне і ў дзіцячай свядомасці. Дзеці любілі чытаць ваенныя кніжкі, гуляць у «вайну», глядзелі разам з дарослымі фільмы і спявалі песні, якія сведчылі пра неперамажнасць Чырвонай Арміі (напрыклад, «Если завтра война», «Броня крепка и танки наши быстры»), выхоўваліся на кінастужках пра герояў Грамадзянскай вайны. Папулярызаваўся ўдзел хлопцаў у гуртках, дзе вучылі страляць, у спаборніцтвах. Таму, калі даведаліся пра напад Германіі на СССР, старэйшыя дзеці (дзеці трэцяй узроставай групы) не спужаліся: «Какая может быть тревога и следует ли поднимать панику, если Красная Армия всех сильнее, и враг будет быстро разбит на его же территории» [3]. Асабліва аптымістычныя настроі былі распаўсюджаны сярод падлеткаў і моладзі: «Усе гавораць: «Вайна!» Мы: «Ура!» Вядома, дзеці... Мы чыталі ў «Піянерскай праўдзе», як вызвалялі Заходнюю Беларусь, як дзеці дапамагалі байцам. І мы ўзрадаваліся, што зараз пакажам, чаго мы вартыя» [4]. Слова «вайна» не выклікала занепакоенасці ў дзяцей, паколькі яны былі знаёмыя з ім па гульнях. Дзеці другой узроставай групы ўвогуле не разумелі значэння гэтага слова, не ведалі яго, чулі ўпершыню. Небяспека адчувалася толькі ў паводзінах дарослых: «Я в то время еще не соображал, что происходит, только видел, как плакала мать с соседками, о чем-то страшном говорили» [5].

Па-іншаму ўспрымалі пачатак вайны дзеці, што пражывалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, каля самай граніцы. Для іх вайна пачалася з першай хвіліны пасля нападу Германіі: «Чую праз сон нейкае гудзенне, быццам гром грукоча, але неяк не так, без перапынку» [4, с. 181]. Паколькі насельніцтва не чакала нападзення, то дзеці памятаюць мітусню дарослых, звязаную з нечаканай эвакуацыяй, калоны бежанцаў. Яны не маглі зразумець, як немцы так хутка апынуліся ў іх родных мясцінах: «У мяне ніяк не мясцілася ў галаве, як гэта ў нашым садзе, дзе на століку пасля ўчарашняй вячэры яшчэ заставаўся самавар, раптам – немцы!» [4, с. 85].

Існавала яшчэ адна асобная катэгорыя дзяцей – дзеці «ворагаў народа», якія выхоўваліся пераважна ў дзіцячых дамах. Яны наведвалі, як і астатнія, школы, але сядзелі асобна, і па адносінах да іх настаўнікаў і вучняў адчувалі сваё прыніжанае становішча. Але вайну ўспрынялі як гора, якое закранула ўсіх: «Война сразу одним махом уравняла всех: исчезли личные обиды. Была одна, общая беда и общий враг у всех» [5, с. 109].

Па меры прасоўвання войска Германіі ўглыб тэрыторыі Савецкага Саюза станавілася зразумелым, што гэтая вайна не на адзін дзень, нават месяц. Але дзеці, як і дарослыя, дэзарыентаваныя афіцыйнай прапагандай, чакалі хуткага вяртання Чырвонай Арміі і не разумелі, чаму яна адступае: «И наш 9-летний мальчишка недоумевал вместе с другими, как такое могло случить-

ся? Ведь «наши» готовились к войне, и даже знали, с кем воевать придется, и вдруг разбежались» [3].

Такім чынам, дзеці знаходзіліся пад уздзеяннем афіцыйнай прапаганды. Гэтая акалічнасць, як і пазіцыя дарослых, у многім паўплывала на фарміраванне прагнастычнага вобразу вайны ў іх свядомасці. Ён, як паказвае аналіз успамінаў, быў вытрыманы ў аптымістычных тонах, але не адпавядаў сапраўднаму стану спраў. Эмоцыі тыпу «ура-патрыятызм» не стасаваліся з рэальнасцю. За памылкі, што былі дапушчаны вышэйшым кіраўніцтвам Савецкага Саюза, прыйшлося расплачвацца грамадзянскаму насельніцтву, у тым ліку і дзецям.

У выніку ўсталявання акупацыйнага рэжыму насельніцтва набыло вопыт суіснавання з ворагам, што садзейнічала складванню ў свядомасці сінхранічнага вобраза. Вайна фарміравала ў дзяцей першы вопыт прыстасавання да экстрэмальных умоў. Зразумела, што ў дзіцячага насельніцтва не было практыкі паводзін у сітуацыях, падобных ваенным, хаця сістэма выхавання імкнулася даць нейкую падобную мадэль (у першую чаргу праз ваенныя гульні). Жахі бамбёжак, забойствы, страта бацькоў выклікала ў дзяцей псіхічныя рэакцыі. Яны доўгі час не размаўлялі, заікаліся, не елі: «Два дні заікаўся, не мог гаварыць [пасля таго, як убачыў расстрэл людзей – *В.Б.*]» [4, с. 162]; «А наш маленькі Толік... ён да вайны ўжо добра хадзіў, добра размаўляў. Цяпер жа перастаў гаварыць і ўвесь час хапаўся за галаву» [4, 183]. У такіх умовах адбылося імклівае, неадпаведнае ўзросту, сталенне дзяцей. З гэтага часу яны пачынаюць выконваць неўласцівыя ім сацыяльныя ролі: забяспечваюць сябе і сям'ю ежай, адзеннем, вопраткай, працуюць: «Немагчыма было заставацца дзіцём. Я глядзела на ўсё вачыма дарослага чалавека» (дзяўчынка 7 гадоў) [4, с. 160].

Побач з непасрэдным асэнсаваннем пачатку вайны, адступлення Чырвонай Арміі, фарміравалася ўяўленне пра акупантаў. Першапачатковая дзіцячая цікавасць перамешвалася з жахам. Малым карцела пытанне: «А якія яны, немцы?» Асэнсаванне вобраза ворага ў дзіцячай свядомасці прымала мастацкую афарбоўку, звязаную з уплывам у першую чаргу казак, дзе вораг выступаў у вобразах, якія традыцыйна сімвалізуюць зло: «На людзей падобныя. Я хацела ўбачыць, якія ў іх галовы. Чамусьці мне ўяўлялася, што ў іх нялюдскія галовы. Мы ўжо ведалі, што яны забіваюць... А яны едуць, смяюцца, жартуюць!.. Маладыя ўсе...» [4, с. 44]. Нават у тых абставінах, калі паводзіны акупантаў, здавалася, не ўяўлялі прамой пагрозы, яны выклікалі недавер і боязь. Немец мог пачаставаць дзіця цукеркамі, а мог і стрэліць яму ў спіну. Для дзяцей ён усё роўна заставаўся захопнікам, заваёўнікам. Як штосьці ненатуральнае ўспрымалася гаворка фашыстаў. Незразумелая, нячутая раней мова параўноўвалася дзецьмі «з злосным сабачым гаўканнем» [4, с. 86]. Але гэта не перашкаджала ім імітаваць на слых іх словы, жартаваць з мовы [6, с. 211].

Вопыт зносін дзяцей з немцамі фарміраваўся паступова. Шмат хто з дзяцей назіраў за жыццём акупантаў уважлівай увачавідкі, паколькі апошнія размясціліся ў іх дамах. Сваімі паводзінамі гітлераўцы давалі адчуць сваю прыналежнасць да «расы господ»: «Не лічылі яны нас людзьмі» [4, с. 52]; «Адчувала знявагу... Ад іх вачэй, ад іх слоў... іх пераканалі, што мы дзікуны» [4, с. 175]. Дзеці, як і дарослыя, выразна адчувалі на сабе практычнае дзеянне расавай тэорыі. Гэтая акалічнасць прыводзіла да яшчэ большага жаху перад гітлераўцамі: «Стаяць... усе маладыя мужчыны, прыгожыя... І такое загадваюць [закапваць мёртвага брата і ўсміхацца – *В.Б.*]. Я ўжо не мёртвых, а гэтых, жывых, баялася» [4, с. 165]. Пачуццё прыніжанасці, знявагі прыйшлося адчуць многім дзецям і падлеткам: «Нас жа вучылі быць добрымі, гуманна адносіцца да ўсяго свету. Калі немец упершыню ўдарыў мяне, я адчуў не боль, я адчуў іншае. Мы не разумелі,

як гэта можна ўдарыць чалавека ні за што» [4, с. 105]. Нават калі гвалт не закранаў канкрэтную сям'ю, то назіранні за сістэматычнымі пакараннямі смерцю не маглі не пакінуць уражанняў, што прыгняталі.

Сінхранічны вобраз – гэта шэраг асацыяцый і пачуццяў, звязаных з перанесенымі псіхічнымі траўмамі. Дзеці 1-й і 2-й узроставых груп асацыіравалі вайну са стратай бацькоў, іх забойствам: «Вайна – гэта калі няма таты» [4, с. 18]. На першы план выступала тое, што найбольш запомнілася, што складала аснову штодзённага жыцця дзяцей у акупацыі: пастаянны голад, чаканне смерці, страх: «Но самым сильным воспоминанием на всю жизнь остался голод. Острое чувство униженности и беззащитности. Остался какой-то неистребимый страх, что на тебя вот-вот ни за что, ни про что накричат, а то и ударят» [7].

Сінхранічны вобраз утрымлівае і некаторыя сімвалы, важныя для ўдзельнікаў разглядаемых падзей. Гэта сцягі і гальштукі. Адзначаныя рэчы чырвонага колеру адыгрывалі важную ролю ў выхаванні падлеткаў, лічыліся неад'емнай часткай піянерскага і камсамольскага жыцця. Захаванне іх у час вайны трактавалася ў савецкай гістарыяграфіі як подзвіг. Гэтая дэталь яскрава падкрэслена ў зборніках успамінаў, выдадзеных у пасляваенны час [8]. Некаторыя дзеці настолькі сур'ёзна адносіліся да гальштукаў і сцягоў, што лічылі, пакуль яны іх берагуць, немцы не змогуць перамагчы: «У дзіцячым уяўленні малявалася такое: сустрэнуць нас немцы, адчыняць чамаданы, а там ляжаць чырвоныя гальштукі... Так мы ім і адпомсцім» [4, с. 131].

Пры аналізе ўспрыняцця вайны мы спыніліся на яго эмацыянальным баку (пачуццёвае ўспрыняцце). Але пры разглядзе вобразу вайны вачыма дзяцей старэйшай групы будзе пераважаць не эмацыянальны, а інтэлектуальны (рацыянальнае, лагічнае асэнсаванне падзей) кампанент. Усталяваны акупацыйны рэжым, забойствы і карныя аперацыі супраць грамадзянскага насельніцтва спрыялі фарміраванню ўстойлівага пачуцця нянавісці да ворага ў дзяцей і непрыняцця такога становішча, асабліва калі рэпрэсіі закраналі непасрэдна іх сем'і. Акрамя гэтага, даваеннае выхаванне, у якім асноўная ўвага надавалася менавіта патрыятычнаму аспекту, прапаганда камсамольцаў-падпольшчыкаў, сяброў, што ўжо дапамагалі партызанам, спрыяла ўсведамленню неабходнасці ўдзелу ў антыфашысцкай барацьбе. Так пашыралася сацыяльная база народнага супраціву. З аднаго боку, гэта была барацьба і дзвюх ідэалогій за патэнцыяльных прыхільнікаў, юных салдат. З другога – уцягванне дзяцей у барацьбу спрыяла дэфармацыі сістэмы каштоўнасцяў. Побач з натуральнымі пачуццямі любові, павагі, гуманнасці ўзмацняюцца нянавісць, прага помсты, абясцэньванне чалавечага жыцця: «У гэты дзень Міхась упершыню за апошнія часы адчуў радасць: ён адпомсціў фашыстам» [8, с. 192]. У дадзеным выпадку бачна, як паняцце «чалавек» замяняецца паняццем «вораг», «чужы», які чалавекам не лічыцца. У партызанскай барацьбе дзяцей часцей за ўсё выкарыстоўвалі як разведчыкаў, сувязных, зборшчыкаў зброі. Камандзіры партызанскіх атрадаў імкнуліся абмежаваць удзел малых у дыверсіях ці ўзброеных аперацыях, таму давалі ім гаспадарчыя даручэнні, але ўступаць у адкрытае супрацьстаянне з ворагам усё ж прыходзілася. І забойствы пакідалі свой след у свядомасці дзіцяці: «Смерть человека от моей руки преследовала меня долго. Мне было тогда только 14 лет» [9]. Партызаны бачыліся дзецям як мужныя, адважныя людзі, што не пабаяліся паўстаць супраць ворага. Яны і іх барацьба ў некаторай ступені рамантызаваліся.

Гераізм дзяцей, які так высока цаніўся ў краіне, быў адначасова і трагічным, таму што ў большасці выпадкаў подзвіг здзяйсняўся за кошт уласнага жыцця. Дзеці-партызаны баяліся трапіць у палон, паколькі ведалі, што іх чакаюць катаванні. Для трапіўшых у акружэнне найлепшым выйсцем

уяўлялася ўласная смерць. Але ў такіх абставінах на першы план высоўвалася натуральнае жаданне жыць.

Рэтраспектыўны вобраз фарміруецца ўжо пасля заканчэння пэўнай падзеі, гэта факт гістарычнай памяці народа. У пасляваенным савецкім грамадстве, як падкрэслівае прафесар А.С. Сяняўская, рэтраспектыўны вобраз Вялікай Айчыннай вайны становіцца «одним из инструментов в решении текущих политических и идеологических задач» [2, с. 53]. Ідэолагі змагаліся за адпаведнае адлюстраванне ваенных падзей у памяці народа. Гэта прывяло да аднабаковасці вобраза. Падкрэсліванне «ура-патрыятызму» ў барацьбе супраць фашыстаў выцясняла на другі план пакуты і трагедыю народа, у тым ліку і дзіцячага насельніцтва, на тэрыторыі акупаванай Беларусі. Подзвігі юных партызан сталі асновай пры выхаванні патрыятызму ў наступных пакаленняў піянераў і камсамольцаў. Такі падыход уніфікаваў малюнак вайны, не паказваў, што ў большасці выпадкаў дзеці станавіліся заложнікамі становішча. Для тых дзяцей, хто быў прымусова вывезены ў Германію, месца ў гісторыі не знаходзілася. Адбыўся падзел дзіцячага насельніцтва на «герояў» і шараговую масу, якія не сталі героямі, але аднолькава з астатнімі пераносілі цяжкасці канцлагераў, акупацыі.

Такім чынам, аналіз успамінаў сведкаў падзей 1941–1944 гг. паказвае, што разглядаемы вобраз вайны не з'яўляўся статычным, а трансфармаваўся пад уздзеяннем шматлікіх фактараў. На змену ўпэўненасці ў непераможнасці Чырвонай Арміі прыходзіла пачуццё неразумення, як маглі так хутка прыйсці немцы, чаму самая магутная ў свеце армія пакінула дзяцей на волю захопнікаў. Перанесеныя жахі акупацыі фарміравалі ўстойлівы ненавісны вобраз ворага, што асацыіраваўся ў дзіцячай свядомасці са стратай бацькоў, прыніжэннем дзіцячай годнасці. Атрыманыя ў сувязі з гэтым псіхічныя траўмы паўплывалі на далейшае развіццё дзяцей як асобаў. Разам з тым, неабходна выдзеліць агульнае ў вобразе вайны, сфарміраваным у дзіцячай свядомасці, – гэта перанесеныя пакуты, здзекі, страта бацькоў і здароўя. У пасляваенным жыцці вайна ўспрымалася імі не ў якасці «главного дела поколения» [10], як для франтавікоў, а часам страты дзяцінства.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Сенявская, Е.С.*** Военно-историческая антропология как новая отрасль исторической науки / Е.С. Сенявская // Военно-историческая антропология. Ежегодник, 2002. – М.: РОССПЭН, 2002. – С. 13.
2. ***Сенявская, Е.С.*** Психология войны в XX веке. Исторический опыт России / Е.С. Сенявская. – М.: РОССПЭН, 1999. – С. 49.
3. ***Кузнецов, М.Т.*** Национал-социализм глазами малолетнего узника. Исповедь о пережитом / М.Т. Кузнецов. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2004. – С. 146.
4. ***Алексіевіч, С.*** Апошнія сведкі: кніга недзіцячых расказаў. (Для ст. шк. узросту) / С. Алексіевіч. – Мінск: Юнацтва, 1985. – С. 19.
5. ***Дзеці вайны: кніга народнай памяці.*** (Для сяр. і ст. шк. узросту) / уклад.: С. Папар, Л.М. Грамовіч. – Мінск: Юнацтва, 1993. – С. 115.
6. ***К'яры, Б.*** Штодзённасць за лініяй фронту: акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 гг.) / Б. К'яры; пер. з ням. Л. Баршчэўскі; нав. рэд. Г. Сагановіч. – Мінск, 2005. – С. 211.
7. ***Мы родом из военного детства:*** кн. воспоминаний / под ред. Н.Н. Трофимчука. – Минск: ГИПП «Промпечать», 1998. – С. 37.
8. ***Ніколі не забудзем:*** расказы беларускіх дзяцей аб днях Вялікай Айчыннай вайны. (Для сяр. і ст. шк. узросту) / маст. І. Давідовіч. – 4-е выд. – Мінск: Юнацтва, 1981. – С. 212–218.
9. ***Спиридонова, Г.Н.*** Воспоминания бывшей пионерки о боевой деятельности и борьбе против фашистов в составе партизанской бригады им. Ленина, 1942–1944 гг. //

Г.Н. Спиридонова // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 9742. – Воп. 2. – Спр. 19. – Арк. 3.
10. ***Кондратьев, В.*** Парадокс фронтовой ностальгии / В. Кондратьев // Литературная газета. – 1990. – 9 мая. – С. 9.

*S U M M A R Y*

*The article is about the perception of the Great Patriotic War by children. The author comes to the conclusion that the image of the war consists of three parts which are based on the different periods of the war. Belarusian children perceive the war as the lost childhood.*

*Поступила в редакцию 22.03.2007*